Установа адукацыі “Полацкая дзяржаўная
гімназія № 1 імя Францыска Скарыны”
Казлова Алена Уладзіміраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

# СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ МАТЭРЫЯЛАЎ ВУЧЭБНАГА КАБІНЕТА ЯК СКЛАДНІК ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Настаўнік, рыхтуючыся да ўрока, падбірае пэўны набор ілюстрацыйнага матэрыялу, схем, табліц, картак, тэстаў, аўдыё- і відэаматэрыялаў, дадатковай літаратуры і г.д. На пачатковым этапе гэта займае немалую колькасць яго часу. З гадамі вопыту матэрыялу такога становіцца ўсё больш. Улічваючы сучасныя магчымасці сеткавага ўзаемадзеяння, наяўнасці інтэрнэт-рэсурсаў, можна сцвярджаць, што праблемы накаплення дыдактычнага матэрыялу сёння няма. А вось з праблемай захавання і выкарыстання ўжо накопленых матэрыялаў сутыкнуўся, напэўна, не адзін педагог.

Аналізуючы палажэнні аб конкурсах прадметных кабінетаў, можна адзначыць абавязковую наяўнасць патрабаванняў да вучэбна-дыдактычнага забеспячэння кабінета. Апошнім часам увага звяртаецца не толькі на наяўнасць матэрыялаў і іх накапленне, а асаблівая ўвага надаецца іх сістэматызацыі.

Сістэма – гэта сукупнасць элементарных структур, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і аб’яднаныя ў адно цэлае выкананнем некаторай агульнай функцыі, што не абмяжоўваецца функцыямі яго кампанентаў [1, с. 10]. Сістэма азначае “цэлае, складзенае з частак”, гэта пэўны парадак у размяшчэнні частак ў цэлым, абумоўлены ўзаемасувязямі паміж кампанентамі. Сістэмны падыход дазваляе ўявіць любую інфармацыю ў адэкватным для ўспрыняцця і запамінання выглядзе, даваць цэласнае апісанне прадмета вывучэння.

Таму задача кожнага настаўніка – асэнсаванае спалучэнне ўсіх кампанентаў (сродкаў навучання), сабраных у прадметным кабінеце, у адзінае

цэлае, распрацоўка сістэмы выкарыстання сродкаў навучання, якія на дадзены момант прадстаўлены ў кабінеце.

Хочацца прапанаваць адзін з варыянтаў сістэматызацыі матэрыялу ў вучэбным кабінеце на прыкладзе распрацаваных модуляў па беларускай літаратуры для 9-11 класаў [гл. Дадатак 1].

За аснову модуля была ўзята вучэбная праграма па прадмеце. У першую частку табліцы модуля фіксуецца назва тэмы ці раздзела. Калі на тэму адводзіцца больш за тры гадзіны, вывучаецца некалькі твораў, мэтазгодна яе разбіць на падтэмы. Напрыклад, на вывучэнне творчасці Якуба Коласа адводзіцца 6 гадзін, таму вызначаюцца наступныя падраздзелы: “Біяграфія паэта”, “Лірыка Коласа”, “Новая зямля”, “На ростанях”.

Пасля вызначэння тэматычнага (у модулі ён вызначаецца па вертыкалі) пачынаецца сістэматызацыя вучэбнага матэрыялу, сабранага ў кабінеце (запаўненне модуля па гарызанталі). Абавязковая на ўроку нагляднасць (табліцы, схемы, ілюстрацыі, партрэты, інш.) фіксуецца ў асобную графу модуля з абавязковым указаннем месца размяшчэння матэрыялу. Відэаматэрыялы (вучэбныя, дакументальныя, мастацкія, мультыплікацыйныя фільмы) таксама сёння займаюць на ўроку пачэснае месца, таму іх таксама фіксуем у асобную графу модуля. Але менавіта відэаматэрыялы патрабуюць папярэдняй апрацоўкі настаўніка. Гэта падбор канкрэтных эпізодаў з фіксацыяй хвілін пачатку і заканчэння прагляду [гл. Дадатак 2], іх анатацыя [гл. Дадатак 3] (для эканоміі каштоўнага часу настаўніка), прадуманая сістэма пытанняў ці заданняў [гл. Дадатак 4] (для эфектыўнага выкарыстання відэафрагмента на ўроку). Наяўнасць у кабінеце камп’ютара, медыяпраектара патрабуюць фіксацыі наяўных камп’ютарных прэзентацый для падтрымкі правядзення ўрока. Сёння можна знайсці ў інтэрнэце прэзентацыю па любой тэме, але не заўсёды знойдзены матэрыял з’яўляецца якасным, пісьменна аформленым, не заўсёды поўнасцю адпавядае патрабаванням вучэбнай праграмы. Таму мэта настаўніка – мець якасны адукацыйны прадукт у выглядзе камп’ютарнай прэзентацыі з фіксацыяй яго ў асобнай графе прадстаўленага модуля.

Аўдыёзапісы таксама занялі важнае месца на ўроках літаратуры (гэта і чытанне артыстамі вершаў, выкананне народных і аўтарскіх песень, радыёспектаклі, аўдыёкнігі). У модулі насупраць канкрэтнай тэмы (раздзела) пазначаецца назва верша, песні, празаічнага ўрыўка, указваецца назва ці нумар дыска, на якім можна знайсці гэты аўдыёзапіс, месца яго размяшчэння. Можна ў модулі фіксаваць працягласць гучання твора для арыентавання настаўніка падчас прадумвання ходу ўрока. Важна таксама прадумаць сістэму захавання аўдыё- і відэаматэрыялаў у кабінеце – стварыць медыятэку. Нельга абысці ўвагай і рэсурсы школьнай бібліятэкі, таму, папрацаваўшы ў ёй з каталогам наяўных матэрыялаў, можна папоўніць модуль карыснымі запісамі.

Асаблівую ўвагу неабходна надаць і фіксаванню ў модулі дыдактычнага раздатачнага вучэбнага матэрыялу. Гэта разнастайныя ўзроўневыя работы, уваходныя і кантрольныя тэсты, літаратурныя дыктанты, віктарыны, крыжаванкі і г.д. Абавязковы нюанс фіксавання такіх матэрыялаў – указанне не толькі размяшчэння, але і колькасці экзэмпляраў той ці іншай работы.

Дадатковыя матэрыялы (альбомы, артыкулы ў кнігах і газетах, вучнёўскія рэфераты, матэрыялы з навукова-метадычных часопісаў) пазначаюцца ў асобную графу модуля.

Трэба падкрэсліць той факт, што вельмі зручна такія модулі мець у электронным і папяровым варыянце. Пры падрыхтоўцы да ўрока настаўнік аналізуе па модулі, які матэрыял накоплены папярэдне па неабходнай тэме. На аснове прадстаўленых матэрыялаў (а іх хутка можна знайсці, бо ў модулі абавязкова фіксуецца месца іх размяшчэння ў кабінеце) педагог плануе ўрок, вызначае патрэбнасць пошуку іншага неабходнага матэрыялу. Электронная версія – для ўнясення карэктыў і паправак, а таксама фіксавання новага напрацаванага матэрыялу. Пры дастаткова істотным папаўненні табліцы абнаўляецца яе папяровая версія.

Такі варыянт “захавання” інфармацыі пра дыдактычныя матэрыялы ў кабінеце дазваляе больш эфектыўна прымяняць накоплены вучэбны матэрыял,

пастаянна працаваць над папаўненнем дыдактычнай базы кабінета (перспектыва бачная на некалькі гадоў наперад).

Для больш якаснага выкарыстання матэрыялаў прадметных навукова-метадычных часопісаў (“Беларуская мова і літаратура”, “Роднае слова”) можна распісваць кожны новы нумар часопіса ў прапанаваную вышэй табліцу. А можна “падключыць” камп’ютарныя тэхналогіі. У прыватнасці камп’ютарная праграма “Бібліятэка 4.0.2” можа вельмі істотна дапамагчы ў сістэматызацыі вучэбнай літаратуры кабінета, часопісных артыкулаў. Распісана каля 300 артыкулаў з вышэй названых часопісаў. Праграма дазваляе пошукі матэрыялаў па ключавым слове, аўтару, назве артыкула ці кнігі, па нумары і годзе выдання часопіса, па класах. Пры дапамозе гэтай праграмы можна ствараць тэматычныя бібліяграфічныя спісы, спісы часопісных артыкулаў на новы навучальны год па канкрэтным класе (з улікам таго, што каталог гэты будзе весціся сістэматычна).

Для эфектыўнай педагагічнай практыкі дыдактычны матэрыял у электронным выглядзе (на камп’ютары ў вучэбным кабінеце) таксама патрабуе строгай сістэматызацыі. Можна захоўваць матэрыялы ў выглядзе такіх жа модуляў, як прапаноўвалася вышэй. Можна ж ствараць комплексы да канкрэтнага ўрока. У асобна заведзенай віртуальнай тэматычнай папцы будуць размяшчацца і ілюстрацыі, і тэматычны кантроль, і відэа- і аўдыёзапісы, інш.

Баяцца вялікай колькасці накапленняў у кабінеце не трэба, бо менавіта багаты накоплены і сістэматызаваны матэрыял дазволіць выбраць той варыянт правядзення заняткаў, які падыдзе менавіта для канкрэтнага вучнёўскага калектыву. Дапаможа індывідуалізаваць работу вучняў, пры пошуку матэрыялаў зэканоміць час настаўніка, а магчыма, і яго калег.

Сістэматызацыя вучэбных матэрыялаў у прадметным кабінеце дазваляе ўдасканальвацца самому настаўніку: бачыць лагічныя заканамернасці размяшчэння і захавання дыдактычнага матэрыялу, ствараць комплексы сродкаў навучання па канкрэтнай тэме, арганізоўваць пошук патрэбнай інфармацыі і аналізаваць яе, афармляць накоплены матэрыял і ўмела выкарыстоўваць яго не адзін год у сваёй педагагічнай практыцы.

Прадстаўлены вопыт сістэматызацыі вучэбных матэрыялаў можа прымяніць любы педагог. Спецыфіка будзе заключацца толькі ў асобых найменнях граф модуля. У прыватнасці да ўрокаў мовы модуль будзе мець наступныя графы: “Тэарэтычны наглядны матэрыял”, “Дыдактычныя матэрыялы, карткі для адпрацоўкі тэмы”, “Уводны і кантрольны тэсты”, “Кантрольныя работы”, “Карэкцыйныя матэрыялы”, “Займальны матэрыял”, інш.

Прапанаваны матэрыял будзе актуальны любому педагогу, які шукае шляхі аптымізацыі сваёй педагагічнай дзейнасці, адміністрацыі, якая адкрывае на базе вучэбнага кабінета рэсурсны цэнтр.

## Літаратура


1. Запрудский, Н.И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем : пособие для учителя / Н.И.Запрудский. – Минск : «Сэр-Вит», 2008. – 336 с.: ил. – (Мастерская учителя)
2. Навумчык, М.І. Дзейнасць кабінета беларускай мовы і літаратуры // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 5. – С. 19-23.
3. Портфолио учителя / сост. Л.П.Макарова. – Волгоград : Учитель, 2010. – 102 с.
4. Прессман, Л.П. Кабинет литературы : пособие для учителей. – Москва : Просвещение, 1983. – 144 с.